# Прычыны дзіцячай агрэсіі

***Прырода дзіцячай агрэсіўнасці заўсёды выклікала цікавасць з боку педагогаў, псіхолагаў, бацькоў менавіта таму, што, вызначыўшы прычыну агрэсіі ў дзяцей, можна з вялікім поспехам гаварыць пра магчымасць яе пераадолення.***

Меркаванне пра тое, што агрэсія выклікае агрэсію, лепш за ўсё ілюструе той факт, што ў з'яўленні дзіцячай агрэсіі вельмі рэдка трэба вінаваціць толькі само дзіця, прыпісваючы яму такія характарыстыкі, як "непаслухмянае", "задзірыстае", "агрэсіўнае" і інш. На самай справе дзіцячая агрэсіўнасць у многім залежыць не столькі ад самога дзіцяці, колькі ад стылю выхавання, паводзін бацькоў і таго мікраасяроддзя, у якім знаходзіцца дзіця. Менавіта паводзіны бацькоў выступаюць у якасці асноўнага ўзору паводзін, якія ў далейшым капіруе дзіця.

Правільны падыход да разумення прыроды і прычын дзіцячай агрэсіі дапамагае знайсці правільны шлях да вырашэння праблемы. Педагагічныя меры, якія зводзяцца толькі да спосабаў змяніць дзіця, не заўсёды могуць прывесці да поспеху. Так, засяродзіўшыся на прафілактычных мерах уздзеяння на дзіцячую агрэсіўнасць, ігнаруючы пры гэтым сапраўдныя яе прычыны, хутчэй можна ўзмацніць праяўленне агрэсіўных рэакцый у дзіцяці, чым іх пераадолець.

Менавіта таму агрэсіўнасць трэба разглядаць як паводзінскую рэакцыю, абумоўленую не толькі індывідуальнымі асаблівасцямі праяўлення характару дзіцяці, але і сацыяльным акружэннем, у якім яно выхоўваецца. Псіхалагічна бяспечнае сацыяльнае акружэнне дзіцяці, якое задавольвае яго духоўныя патрэбы, здольна пераадолець дзіцячую агрэсію і дасягнуць узаемаразумення ў сістэме "дарослы — дзіця". Бо ў задавальненні духоўных патрэб з боку дарослых больш за ўсё маюць патрэбу агрэсіўныя дзеці.



Што ж можа быць прычынай дзіцячай агрэсіўнасці? Няўпэўненасць у сабе, якая маскіруецца пад агрэсіяй як спосабам абароны ў выпадках парушэння псіхалагічнай бяспекі. Таксама сярод прычын агрэсіі можна вылучыць эмацыянальную нестабільнасць, якая характарызуецца хуткай зменай настрою, зласлівасцю і імпульсіўнасцю. І канечне, індывідуальныя асаблівасці характару і тэмпераменту.

Сярод знешніх прычын можна вылучыць непрыняцце дзіцяці бацькамі. Дзіця, адчуваючы, што яно ў сям'і эмацыянальна не прынята, пачынае адчуваць раззлаванасць і крыўду. Гіперапека, гіпаапека, празмерная патрабавальнасць таксама з'яўляюцца фактарамі, якія правакуюць агрэсіўныя рэакцыі ў дзяцей. Асабліва, напэўна, самае значнае месца ў спісе прычын дзіцячай агрэсіі займае незадавальненне духоўных патрэб дзіцяці ці іх падмена матэрыяльнымі каштоўнасцямі.

Толькі вызначыўшы сапраўдныя матыў агрэсіўных паводзін, дарослыя здольны дапамагчы дзіцяці пераадолець такія рэакцыі і апытымізаваць узаемаадносіны з дзіцем.

Эфектыўнымі метадамі работы з дзіцячай агрэсіўнасцю з'яўляюцца гульні, эцюды, казкатэрапеўтычныя гутаркі, арт-тэрапеўтычныя тэхнікі (выяўленчая тэрапія, пясочная тэрапія), трэнінгі. Мэта гэтых метадаў зводзіцца ў большай ступені да выхаду заблакіраванай агрэсіі, фарміравання навыкаў канструктыўнага ўзаемадзеяння, павышэння самаацэнкі, самапрыняцця і развіцця даверу.

Пры аналізе дзіцячай агрэсіі неабходна, перш за ўсё, улічваць той факт, што агрэсія, як гэта парадаксальна ні гучыць, звязана ў большай ступені з дзіцячай слабасцю, чым з сілай. Менавіта таму агрэсіўныя дзеці больш за ўсіх маюць патрэбу ў падтрымцы і разуменні. Толькі праз прыняцце дзіцяці, абапіраючыся на яго моцныя і станоўчыя рэсурсы, можна дасягнуць гармоніі ў зносінах з агрэсіўным дзіцем.

**Ларыса ГЛАЗКОВА,**
**педагог-псіхолаг ясляў-сада № 67 Гродна.**